# Неверагодная гісторыя клічніка!

**У сучасных рэаліях усе свае эмоцыі часцяком даводзіцца канвертаваць у тэкставы фармат і выражаць праз смайлікі і стыкеры з шакаванымі коткамі. Але ёсць і куды больш правераны спосаб паказаць суразмоўцу, што вы на мяжы. Клічнік! Старая добрая палачка з кропкай можа ператварыць любую фразу ў сапраўдны крык душы. Але адкуль ён узяўся? Якая неверагодная гісторыя за ім стаіць? І чаму мы ставім адзін ці тры клічнікі, але ніколі не два? У гэтым уступе занадта шмат пытанняў – давайце пашукаем адказы.**

## Гістарычныя вытокі!

Цяпер цяжка ўявіць жыццё без знакаў прыпынку і прабелаў, але існавалі яны далёка не заўсёды. Старажытныя тэксты спачатку ўяўлялі проста бесперапынны паток літар, які трэба было ўдумліва чытаць і разбірацца, што ўсё гэта значыць. Такі стыль называюць scriptio continua.

Чытаць гэтыя тэксты было вельмі няпроста, таму ў VI стагоддзі н. э. з'явілася такая маленькая пісьменніцкая ўмоўнасць, як пунктуацыя і інтэрвалы паміж словамі. Усё ж чытацкая аўдыторыя расла, а разам з ёй павялічвалася і колькасць незадаволеных вар'яцкім патокам непарыўных літар. Да таго ж з прабеламі і коскамі памяншаўся шанец на тое, што тэкст няправільна зразумеюць. Карацей, суцэльныя плюсы.

Недзе ў той перыяд і пачынаецца гісторыя клічніка. Вось адзін з варыянтаў яго паходжання (зразумела, недакладны, няпэўны і не пацверджаны нікім, але ўсё яшчэ цікавы). Лічыцца, што з'явіўся ён як накладанне лацінскага воклічу «Io», якое выяўляла: а) радасць; б) боль. Але ў абодвух выпадках суправаджалася воклічам. «I» паступова расцягвалася над «O», якая тым часам скурчвалася ў кропку, і ўсё гэта шчасна ўтварыла той самы клічнік.

Гісторыя амаль праўдападобная. У адным яна цалкам мае рацыю: у адрозненне ад іншых знакаў пунктуацыі, клічнік – гэта знак, які ўвасабляе ў сабе нястрымную эмоцыю. Няхай гэта будзе раптоўная добрая навіна або ўдар мезенцам аб дзверы, усё спараджае ў вас выкрык, які рвецца вонкі.

## Час для патэнта!

Такім чынам, знакі, падобныя да клічніка, перыядычна з'яўляюцца ў некаторых тэкстах для выражэння розных пачуццяў. Але! Яны робяць гэта без дакументальных



Крыніца: https://www.nlb.by/by/news/a-tarski-poglyad/neveragodnaya-gistoryya-klichnika/

пацвярджэнняў, а значыць, час літаральна вынайсці клічнік – ва ўсіх бюракратычных сэнсах.

У канцы XIV стагоддзя італьянскі паэт Якопа Альпалея да Урбісалья аб’яўляе: ён штосьці вынайшаў. Новы знак пунктуацыі, punctus admirativus – «кропку захаплення»! Публіка ў экстазе, філолагі апладзіруюць, самыя ўражлівыя страчваюць прытомнасць ад лішку пачуццяў. Цяпер усе граматыкі абавязкова згадваюць «кропку захаплення» як важны знак прыпынку, перыядычна блытаючыся ў фармулёўках. Так «кропка захаплення» часам ператваралася ў «кропку воклічу». Не зусім дакладна, але ў прынцыпе зразумела.

Зрэшты, такая блытаніна ўсё роўна спарадзіла некаторыя спрэчкі ў шэрагах апантаных аматараў літаратуры. Некаторы час пісьменнікі нават падзялялі «кропку захаплення» і «клічнік»: першая выкарыстоўвалася для выказвання захаплення і здзіўлення, другі ж – для гневу, гора і іншых негатыўных эмоцый. Выглядалі, зрэшты, абодва знакі аднолькава.

Да XIX стагоддзя гэтыя спрэчкі паступова зніклі, бо вокліч у назве знака перамог захапленне. З гэтага часу ніякіх «кропак захаплення», толькі клічнік.

## Страх і нянавісць у клічніках!

Здавалася б, усе страсці аціхлі, цяпер стары новы знак прыпынку стане натуральнай і звыклай часткай любога тэксту… Ці не так? Насамрэч, не. Канчатковае разуменне гэтага знака як воклічу стала прычынай вельмі спецыфічнага стаўлення да яго. Нават кнігі па граматыцы рэкамендавалі яго выкарыстоўваць толькі ў асаблівых выпадках і ўвогуле не злоўжываць. Фрэнсіс Скот Фіцджэральд называў клічнікі «смехам над уласным жартам» (абразліва). Нават філосаф Тэадор Адорна (вельмі сур’ёзны на першы погляд чалавек) уступіў на сцежку нянавісці да гэтага знака, называючы яго «адчайным пісьмовым жэстам, які марна імкнецца выйсці за межы мовы». Увогуле, усе лічылі, што клічнік ператварае тэкст у сумнеўны і безгустоўны. Настолькі, што нават клавіша з гэтым знакам для пішучых машынак з’явілася толькі ў 1970 годзе.

## Эпічнае вяртанне клічніка!

Час ішоў, людзі станавіліся ўсё менш высакамернымі, а анлайн-зносіны цалкам вярнулі клічніку былую веліч. Цяпер ён не заўсёды нясе ў сабе падтэкст крыку. Успомніце свае дзелавыя лісты – пэўна ж, у канцы часткі з іх вы абавязкова пісалі «Дзякуй!», не маючы на ўвазе гучнае выкрыкванне падзякі.

Клічнік пранікае ў нашы паведамленні, вяртаючы сабе старую функцыю – выражэнне захаплення і здзіўлення, без усялякіх крыкаў і ціску на суразмоўцу. Але выкарыстоўваць больш як адзін у сказе ўсё ж не варта. Два клічнікі ўспрымаюцца як нешта непрымальнае.

Вяртайце радасць у сваё жыццё – стаўце клічнікі! (Без перабору!!!)

*Паліна ДОЛЯ, вядучы бібліятэкар*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*